*ІНФАРМАЦЫЙНЫ ЛІСТ – ЗАПРАШЭННЕ*

BELARUS ICOMOS

EUROBELARUS МІЖНАРОДНЫ КАНСОРЦЫЮМ

# Навукова-практычная канферэнцыя «ПРАВА НА СПАДЧЫНУ» І ДЗЯРЖАЎНЫ СПІС ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫХ КАШТОЎНАСЦЕЙ: ВЫКЛІКІ І РАШЭННІ

Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь з’яўляецца асноўным дакументам іх дзяржаўнага ўліку. Унясенне аб'екта ў спіс – ключавое рашэнне, якое азначае ўзяцце помніка пад апеку дзяржаўных органаў. У гэты момант у яго жыцці адбываюцца дзве радыкальныя змены: па-першае, захаванне аб'екта дэкларуецца прыярытэтным над усімі іншымі рэжымамі яго існавання; па-другое, уключэнне ў спіс легітымізуе права на ўдзел у прыняцці рашэнняў адносна лёса аб'екта з боку экспертаў, грамадскасці ды мясцовых супольнасцяў.

Ухвалены ўпершыню французскай Камісіяй гістарычных помнікаў у 1840 г., спіс помнікаў стаў найбольш распаўсюджаным інструментам кіравання культурнай спадчынай. За больш чым 150 гадоў у свеце сфарміраваліся сістэмы аховы, што прапануюць розныя балансы захавання і выкарыстання аб'ектаў, спосабы ўзгаднення рашэнняў па іх, а таксама варыянты кампенсацыяў за аслабленне правоў уласнасці.

Хутка споўніцца трыццаць гадоў як Рэспубліка Беларусь ажыццяўляе самастойнае кіраванне аб'ектамі ўласнай культурнай спадчыны. Гэты кароткі па гістарычных мерках прамежак умясціў неверагодныя змены ў эканамічным, сацыяльным і культурным жыцці краіны. Змянялася і ахоўнае заканадаўства. Сёння Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь змяшчае амаль 5,5 тыс. нерухомых аб'ектаў спадчыны, і гэта лічба расце. Наспеў час правесці агляд склаўшыхся практык як папаўнення спіса, гэтак і кіравання ўключанымі ў яго аб'ектамі.

У сувязі з гэтым грамадскае аб'яднанне «Беларускі камітэт ІКАМОС» пры ўдзеле МНДА «ЕўраБеларусь» абвяшчае збор заявак на ўдзел у **канферэнцыі «Права на спадчыну» і Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей: выклікі і рашэнні», якая адбудзецца ў Мінску 19-20 чэрвеня 2020 года.**

Мэтамі канферэнцыі з'яўляюцца: 1) вывучэнне сітуацыі з захаваннем і аднаўленнем розных катэгорый нерухомай спадчыны, уключаных у Дзяржаўны спіс; 2) наладжванне дыялогу паміж дзяржаўнымі органамі, экспертамі, грамадскасцю, уласнікамі і прадстаўнікамі мясцовых супольнасцяў у справе захавання і аднаўлення помнікаў; 3) вылучэнне найлепшых практык кіравання аб'ектамі нерухомай спадчыны і вызначэнне перспектыў для рэфармавання ахоўнага і рэстаўрацыйнага заканадаўства ў Беларусі.

Канферэнцыя засяродзіць увагу на трох тэматычных кірунках:

1) **Нацыянальны ўзровень.** У дадзенай секцыі будуць разглядацца пытанні сістэмнага рэгулявання працэсаў аховы і рэстаўрацыі.
   **Пытанні для абмеркавання:** Якую ролю граюць дзяржаўныя экспертныя саветы? Ці дастатковы ўдзел грамадскасці ў кіраванні? Наколькі аптымальная сістэма ўзгаднення праектных рашэнняў пры рэстаўрацыі і рэканструкцыі помнікаў? Як працэдуры Міністэрства культуры ў дачыненні да помнікаў суадносяцца з працэдурамі іншых органаў кіравання? Якія катэгорыі ўласнікаў аб'ектаў спадчыны найбольш эфектыўныя? Якога кшталту дзяржаўная падтрымка патрабуецца ўласнікам і мясцовым органам кіравання?

2) **Лакальны ўзровень.** У дадзенай секцыі будуць разглядацца мясцовыя праблемы і асаблівасці кіравання аб'ектамі спадчыны.
   **Пытанні для абмеркавання:** Ці могуць рэгіянальныя ўлады або мясцовыя супольнасці браць большы ўдзел у кіраванні аб'ектамі спадчыны? Ці гатовы яны да адказнасці? Як зрабіць грамадскія слуханні эфектыўным інструментам прыняцця рашэнняў? Што адбываецца з інвестыцыйнай прывабнасцю аб'ектаў пасля ўключэння ў спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей? Ці існуюць эфектыўныя практыкі захавання і аднаўлення аб'ектаў без уключэння ў Дзяржаўны спіс?

3) **Асобныя катэгорыі спадчыны.** У дадзенай секцыі будзе разглядацца сітуацыя з асобнымі катэгорыямі гісторыка-культурных каштоўнасцей.
   **Пытанні для абмеркавання:** Як складваецца сітуацыя з гістарычнымі могілкамі, сінагогамі, сядзібамі, храмамі, драўлянай архітэктурай, архітэктурай мадэрнізму, археалагічнымі аб'ектамі і інш? Ці сапраўды ўнясенне аб'ектаў у дзяржаўны спіс садзейнічае іх лепшай захаванасці? Якім катэгорыям аб'ектаў спіс дапамагае, а для якіх ён не самы эфектыўны?

**Да ўдзелу ў канферэнцыі запрашаюцца**: прадстаўнікі дзяржаўных органаў, адказных за ахову гісторыка-культурнай спадчыны; удзельнікі экспертных саветаў па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны; супрацоўнікі ўстаноў культуры; прадстаўнікі грамадскасці, а таксама мясцовых супольнасцяў; уласнікі аб'ектаў гісторыка-культурнай спадчыны; архітэктары і рэстаўратары; даследчыкі і іншыя зацікаўленыя асобы.

Падаць заяўку на ўдзел можна праз форму на сайце канферэнцыі, альбо даслаўшы тэкставы файл у фармаце *.doc ці *.docx **да 1 чэрвеня 2020 года** ўключна на электронны адрас belarus.icomos@gmail.com .

У заяўцы на email абавязкова ўказаць:

1) імя і прозвішча дакладчыка;
2) месца працы або арганізацыю, якую прадстаўляе дакладчык, яго пасаду;
3) электронны адрас і тэлефон дакладчыка;
4) назву даклада з пазначэннем прыярытэтнай секцыі (аргкамітэт мае права пераразмяркоўваць даклады па секцыях на ўласны погляд);
5) кароткі змест даклада (200-300 словаў).

Праграма канферэнцыі, адрас правядзення ў Мінску і расклад будуць паведамлены не пазней чым за тры тыдні да падзеі.

Удзел у канферэнцыі бясплатны. Выбраныя даклады будуць апублікаваныя. Пры складанні праграмы аргкамітэт мае права пераразмяркоўваць даклады па секцыях.

Праезд і пражыванне ў Мінску адбываецца за кошт удзельнікаў або арганізацый, якія яны прадстаўляюць. Аргкамітэт канферэнцыі пакідае за сабой права адхіляць заяўкі, адмаўляць аўтарам у публікацыі тэкстаў па прычыне неадпаведнасці тэматыкі ці нізкай акадэмічнай/тэхнічнай якасці прапанаванага матэрыяла.